Л. Цвяткоў у артыкуле “Некалькі слоў аб менскіх татарах” (1927 г.) [4], звярнуў увагу на тую акалічнасць, што пытанне нацыянальнай прыналежнасці беларускіх татараў з’яўляецца дыскусійным і слаба распрацаваным. Даследчык адзначыў, што татарскае насельніцтва можна разглядаць як спецыфічную рэлігійную групу беларусаў-мусульман [4, с. 17]. Аднак, навуковец у далейшым не развіваў сваю ідэю. Іншыя даследчыкі, прызнаючы культурную блізкасць беларусаў з мясцовымі татарамі, не ставілі пад пытанне факт нацыянальнай прыналежнасці апошніх.

Важнай крыніцай для разумення сэнсу тэрміна “нацыянальная меншасць” з’яўляецца зборнік “Практическое разрешение национального вопроса в БССР” (1928 г.) [5]. У прадмове да выдання старшыня Нацыянальнай камісіі пры ЦВК БССР А. Хацкевіч, канстатуючы поспехі палітыкі беларусізацыі, адзначае, што настала пара разглядаць у якасці адной з нацыянальных меншасцей рускае насельніцтва Савецкай Беларусі і праводзіць сярод яго прадстаўнікоў адмысловую работу [5, с. 4]. Тым самым, заўважна пазіцыя кіруючых органаў да вызначэння нацыянальных меншасцей – іншанацыянальная група насельніцтва, якая мае патрэбу ў правядзенні мерапрыемстваў накіраваных на задавальненне культурных патрэб на роднай мове для захавання нацыянальнай тоеснасці яе прадстаўнікоў.

Варта спыніцца і яшчэ на адным тэрміне, які актыўна ўжываўся ў працах міжваеннага перыяду прысвечаных нацыянальным меншасцям у Беларусі. Такім тэрмінам выступала “калонія” [2, с. 144]. Яго выкарыстанне характэрна пры апісанні кампактных пасяленняў іншанацыянальнага насельніцтва у сельскай мясцовасці. Таксама ён мог ўжывацца і ў больш шырокім сэнсе каб падкрэсліць перасяленчы характар пэўнай нацыянальнай меншасці (напрыклад латышы, літоўцы, эстонцы і інш.) [6]. Аднак ужо да сярэдзіны 1930-х гг. заўважны паступовы адыход ад яго выкарыстання ў літаратуры. Апошняе варта звязаць з шэрагам акалічнасцей. Папершае, ужо ў канцы 1920-ых гг. прадстаўнікі кіраўніцтва СССР звярталі ўвагу на шкоднасць для сацыялістычнага будаўніцтва памянёнага тэрміна. Так, адзін з галоўных тэарэтыкаў нацыянальнага пытання ў СССР М. Скрыпнік ў 1929 г. наступным чынам выказваўся на конт адзначанага слова: “Трэба не толькі само слова вытравіць калёным жалезам, але і саму псіхалогію каланісцкую” [Цыт. па: 7, с. 473]. Па-другое, працэс калектывізацыі ў значнай ступені нівеліраваў адметнасці ў спосабах вядзення гаспадаркі, якія існавалі ў прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, садзейнічаў складванню эканамічнай роўнасці з прадстаўнікамі тытульнай нацыянальнасці. У сувязі з апошнім галоўная ўвага надавалася сацыяльнаму паходжанню іншанацыянальнага насельніцтва.

**Заключэнне.** На працягу міжваеннага перыяду ў працах прысвечаных іншанацыянальнаму насельніцтву Беларусі ў якасці асноўнага тэрміна замацавалася словазлучэнне “нацыянальная меншасць”. Памянёны тэрмін не меў повязі з расійскай імперскай навуковай і публіцыстычнай думкай і меў больш шырокае сэнсавае значэнне. Акрамя таго, значнае распаўсюджванне ў навуковай і публіцыстычнай літаратуры атрымаў тэрмін “калонія” для вызначэння вясковага насельніцтва.


1. Инородческая школа прежде и теперь // Школа и культура Советской Белоруссии, 1919. – № 2–3. – С. 10–13.
2. Смоліч, А.А. Географія Беларусі /А.А. Смоліч. – Выд. 4-е. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993 – 405 с.
3. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6.
4. Цвяткоў, Л. Некалькі слоў аб менскіх татарах / Л. Цвяткоў // Наш край, 1927. – № 6–7. – С. 10 – 17.
5. Практическое разрешение национального вопроса в БССР. – Ч. 2 : Работа среди национальных меньшинств в БССР. – Минск : Изд. Нацкам. ЦВК БССР, 1928. – 159 с.
6. Шкільтэр, К.Ю. Латыскія колёніі на Беларусі. Гістарычнае разьвіцьцё латыскіх сялянскіх гаспадарак. / К. Ю. Шкільтэр. – Менск : Беларуская акадэмія навук, 1931. – 271 с.
7. Дённингхаус, В. В тени “Большого Брата” : Западные национальные меньшинства в СССР (1917 – 1938 гг.) / В. Дённингхаус. – Москва : РОССПЭН, 2011. – 727 с.


## ВІЦЕБСКІЯ ГУБЕРНАТАРЫ І АСВЕТА Ў 1860–1890-Я ГГ.


*Я.М. Ляпешкін*
*Мінск, БДУ*


Вышэйшымі прадстаўнікамі губернскай адміністрацыі з’яўляліся губернатары. Яны рэалізоўвалі палітыку цэнтра на лакальным узроўні, але характар яе ажыццяўлення залежыў ад іх асабістых якасцяў. Даследаванне гэтай катэгорыі чыноўнікаў уяўляецца актуальным, бо



Репозиторий ВГУ

дазваляе прасачыць ад каго залежылі галоўныя кірункі культурна-адукацыяйнага развіцця ў губернях.

Мэта даследавання – аналіз ўплыву дзейнасці губернатараў на фарміраванне мясцовай адукацыі, тэатра і выданне архіўных дакументаў.

**Матэрыял і метады**. Падчас даследчай працы былі выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Метадамі даследавання з'яўляюцца агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. начальнікі беларускіх губерняў у асветна-культурнай галіне імкнуліся спрыяць дасягненню палітычнай мэты – "абрусенню мясцовасці шляхам адукацыі маладога пакалення" [1, арк. 7, 8 зв.]. Разам з тым губернатары спрыялі павышэнню адукацыйнага ўзроўню грамадства. У гэтым аспекце найбольшую актыўнасць праявіў начальнік Віцебскай губерні П. Я. Растоўцаў (1869–1880).

Так, Суражская гарадская дума па прапанове П. Я. Растоўцава вырашыла за кошт гараджан набыць будынак для народнага вучылішча. Дзякуючы намаганням губернатара 3-класная Віцебская жаночая гімназія была ператорана ў 7-класную. У 1872 г. па прапанове П. Я. Растоўцава ў Полацку была адкрыта настаўніцкая семінарыя. Пасля адкрыцця чарговай бясплатнай школы для дзяцей бедных жыхароў Віцебска, губернатар звяртаўся ў Дырэкцыю віцебскіх народных вучылішчаў з просьбай забяспечыць навучэнцаў неабходнымі рэчамі [2, с. 183–184].

Міністэрства народнай асветы (МНА) пры вырашэнні пэўных пытанняў звярталася да Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), якое ў сваю чаргу высвятляла меркаванні па адпаведных прадметах у губернатара. У 1886 г. МНА звярнулася да МУС з прапановай утрымання прыходскіх вучылішчаў за кошт гарадоў. МУС паслала запрос губернатарам, у тым ліку віцебскаму, з тым, каб даведацца іх меркаванні [3, арк. 1–1 зв.].

У гарадскіх прыходскіх вучылішчах навучаліся ў асноўным дзеці беднага хрысціянскага насельніцтва. Таму 29 красавіка 1887 г. у адказ на запыт Гаспадарчага дэпартамента МУС віцебскі губернатар В. М. Далгарукаў (1884–1894) прапанаваў аднесці ўтрыманне прыходскіх вучылішчаў да ліку абавязковых гарадскіх выдаткаў. З 1891 г. органы гарадскога самакіравання заканадаўча абавязваліся несці выдаткі на ўтрыманне прыходскіх вучылішчаў [4, с. 87; 3, арк. 47–48].

16 мая 1895 г. у Камітэце міністраў слухалі запіску віцебскага губернатара У.А. Левашова (1894–1899) аб першым аб'ездзе губерні. Паведамлялася, што царкоўна-прыходскія школы і вучылішчы МНА складалі "галоўную аснову насаджэння ў народзе пісьменнасці" Але, на думку губернатара, "іх яшчэ мала і асабліва рэдкія яны там, дзе мала цэркваў" [5, с. 21, 23]. Навучанне ў гэтых школах павінна было адбывацца на рускай мове. Віцебскія ўлады таксама клапаціліся пра належныя ўмовы мясцовага тэатральнага жыцця.

У 1873–1875 гг. у Віцебску перабудавалі будынак паліцэйскай часткі для новага гарадскога тэатра [6, с. 69–70]. Гэту ініцыятыву гарадской супольнасці падтрымаў губернатар П. Я. Растоўцаў. Яшчэ ў 1870 г. ён звяртаўся да міністра ўнутраных спраў з просьбай аказаць дапамогу ў адкрыцці прыстойнага рускага тэатра. Ён жа хадайнічаў перад міністрам аб зацвярджэнні статута Віцебскага музычнага таварыства [2, с. 184–185].

Дзякуючы асабістым намаганням П.Я. Растоўцава па пераўладкаванню будынка для тэатра, віцебская гарадская супольнасць хадайнічала аб наданні гарадскому тэатру імя губернатара. 10 студзеня 1874 г. імператарскім указам, па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў, віцебскаму гарадскому тэатру было нададзена імя П. Я. Растоўцава [6, с. 70].

Вырашэнне фінансавых пытанняў у галіне асветы таксама залежыла ад начальнікаў губерняў. У пацвярджэнне чаго можна прывесці прыклад з гісторыі архіўнай справы.

Архіварыўс Цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерняў А.М. Сазонаў у рапарце віцебскаму губернатару В. М. Далгарукаву ад 23 красавіка 1885 г. дакладваў, што на выданне XV выпуску Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў на 1884 г. было асігнавана 2000 руб. З гэтага крэдыту было выдаткавана 1161 руб. 90 кап. Таму А.М. Сазонаў прасіў губернатара адпусціць яму з крэдыту 1884 г. астатнія 838 руб. 10 кап. на пакрыццё чарговых расходаў па выданні XV выпуску Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў. В.М. Далгарукаў напісаў на дакуменце – "выканаць". З Віцебскага губернскага казначэйства 28 красавіка 1885 г. на імя А.М. Сазонава быў выпісаны талон да авансавай асігноўкі на суму 838 руб. 50 кап. [7, арк. 61–61 зв., 63].



Рэпазіторый ВДУ

**Заключэнне**. У службовыя абавязкі віцебскіх губернатараў уваходзіла правядзенне на месцах урадавай палітыкі ў галіне асветы. У той жа час з імі кансультаваліся міністры, яны выступалі з уласнымі прапановамі і сваёй зацікаўленасцю і адміністрацыйнай уладай садзейнічалі культурнаму развіццю на падначаленых тэрыторыях. Губернатары аказвалі падтрымку пашырэнню дзяржаўнай (расійскай) пачатковай і сярэдняй адукацыі сярод мясцовага насельніцтва, фінансавалі пэўныя выдавецкія праекты. Пры гэтым адрозненні шматэтнічнага і шматрэлігійнага тутэйшага жыхарства, павінны былі сціраццa на карысць дзяржаўнай мовы і культуры (расійскай). Да таго ж усе дасягненні былі арыентаваны на патрэбы Расійскай імперыі і рэдка ўлічвалі гістарычныя традыцыі, этна-лінгвістычныя асаблівасці краю і інтарэсы беларускага насельніцтва.


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 981. Переписка с попечителем Виленского учебного округа, директором народных училищ Витебской и Могилевской губ. о предоставлении сведений о строительстве народных училищ, об отпуске средств на строительство и др.
2. Вернер, И. Л. На губернаторском посту (о деятельности Павла Яковлевича Ростовцева по управлению Витебской губернией в 1869–1880 гг.) / И. Л. Вернер // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. / рэдкал.: Ю. М. Бохан [і інш.]. – Мінск: НГАБ, 2007. – Вып. 5. – С. 175–187.
3. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 38614. Дело по отношению Хозяйственного департамента МВД о признании обязательным для городов выделение средств в помощь казне на содержание приходских училищ.
4. Моторова, Н. С. Деятельность органов городского самоуправления на территории Беларуси в социальной сфере (1875–1914 гг.): дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Н. С. Моторова. – Минск, 2010. – 156 л.
5. Свод высочайших отметок по всеподданнейшим отчетам генерал-губернаторов, губернаторов, военных губернаторов и градоначальников за 1893 год. – СПб.: Гос. тип., 1895. – XXXIX, 117 с.
6. Кучеренко, В. Н. Культура Витебска конца XIX – начала XX в.: Витебский городской Ростовцевский театр (1873–1917 гг.) / В. Н. Кучеренко // Искусство и культура. – 2012. – № 1 (5). – С. 68–74.
7. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 53047. Дело о деньгах, переданных быв. витебским губернатором фон-Фалем на сыскную часть и на издание историко-юридических материалов.


## РАЗВИТИЕ БЕЛОРУССКОЙ ИСТОРИЧЕСКОЙ НАУКИ (1944–1961 ГГ.)


*С.А. Моторов, Л.А. Моторова*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Историческая наука по праву занимает одно из ведущих мест в системе гуманитарного знания. Объективный и беспристрастный анализ исторического прошлого во многом определяет парадигму успешного движения общества по пути прогресса в будущем.

Целью данной работы является критическое осмысление роли белорусской исторической науки в один из самых сложных и неоднозначных периодов жизни белорусского общества – период 40-х – 50-х гг. XX века.

**Материал и методы.** Источниковую базу исследования составили документальные материалы фондов Национального архива Республики Беларусь, инструкции, постановления, циркулярные письма, материалы исторических исследований и периодической печати. Методологическая основа исследования – принципы объективности и историзма. В работе применялись общенаучные методы анализа и синтеза, индукции и дедукции, а также специально-исторические: историко-системный, сравнительно-сопоставительный, ретроспективный.

**Результаты и их обсуждение.** Содержание и качество научно-исследовательской работы белорусских историков определялись влиянием идеологического фактора. Идеология сталинизма, безраздельно господствовавшая в советском обществе в 40-ые и в начале 50-ых годов, непримиримо относилась к самостоятельности учёных, к их творческим поискам, проявлениям оригинальности и тем более, к элементам критического отношения к советской действительности. Сталинский режим монополизировал право по своему усмотрению направлять творчество научной интеллигенции, сознательно насаждал в её среде казарменное единообразие, конформизм, приспособленчество и, в конечном итоге, серость и посредственность. Всё это вело не к расцвету науки, как утверждала официальная пропаганда, но, наоборот, способствовало её деградации.

По отношению к гуманитарным наукам идеологический аппарат вообще возложил на себя функцию до мельчайших деталей определять не только *что,* но и *каким образом* изучать.

Подобные методологические установки в области исторических исследований способствовали созданию чётко ограниченных рамок научного поиска, отход от которых грозил тяжелейшим обвинением в «национализме». Поэтому, представители белорусской исторической

Репозиторий ВГУ